# КУЛЬТУРНЫ ПЛАСТ ЯК СКАРБНІЦА МІЛІТАРНЫХ АРТЭФАКТАЎ (ВОЙНЫ ВАЧЫМА АРХЕОЛАГА)

# КУЛЬТУРНЫЙ СЛОЙ КАК СОКРОВИЩНИЦА ВОЕННЫХ АРТЕФАКТОВ (ВОЙНА ГЛАЗАМИ АРХЕОЛОГА)

# THE CULTURAL LAYER AS A TREASURY OF MILITARY ARTIFACTS (WAR THROUGH THE EYES OF AN ARCHEOLOGIST)

***Н.І. Здановіч***

***Н.И. Зданович***

***N.I. Zdanovich***

Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт,
Мінск, Беларусь, *ninazdan59@belstu.by*
Белорусский государственный технологический университет,
Минск, Беларусь, *ninazdan59@belstu.by*
Belarusian State Technological University,
Minsk, Belarus, *ninazdan59@belstu.by*

Артыкул прысвечаны разгляду слядоў войнаў у архітэктуры і матэрыяльнай культуры Беларусі. Культурныя пласты розных тыпаў паселішчаў ад першабытных часоў да ХХ ст. аналізуюцца на наяўнасць мілітарных артэфактаў. Разглядаецца ўплыў войнаў на развіццё матэрыяльнай культуры Беларусі.

*Ключавыя словы:* вайна; замкі; культурны пласт; мілітарныя артэфакты.

Статья посвящена рассмотрению следов войн в архитектуре и материальной культуре Беларуси. Культурные слои поселений разных типов от первобытных времен до ХХ века анализируются на наличие военных артефактов. Рассмотрено влияние войн на развитие материальной культуры Беларуси.

*Ключевые слова:* война; замки; культурный слой; военные артефакты.

The article is devoted to the examination of wars traces in the architecture and material culture of Belarus. Cultural layers of various types of settlements from primitive times to the 20th century are analyzed for the presence of military artifacts. The influence of wars on the development of the material culture of Belarus is considered.

*Keywords:* war; castle; cultural layer; military artifacts.

Беларусь воляю лёсу ўкрыжавана пасярод Еўропы на памежжы рэлігійных трыдыцый (паміж каталіцкім Захадам і праваслаўным Усходам), на стыку геапалітычных амбіцый з абодвух бакоў. У супрацьстаянні Захаду і Ўсходу яе тэрыторыя станавілася арэнай змагання, а варожыя арміі звычайна пракатваліся па ёй двойчы: наступаючы і адступаючы. Сляды гэтых падзей прасочваюцца ў гісторыі архітэктуры, у дэмаграфіі і ў матэрыяльнай культуры. Найперш гэта разбураныя замкі, якія былі аплотам абароны. Замак XIV ст. у

Лідзе, які быў захоплены крыжакамі толькі аднойчы, у люты мароз XIV ст., быў моцна пашкоджаны падчас вайны 1654-67 гг. і фактычна страціў стратэгічнае значэнне, аднак у 1706 г. быў канчаткова знішчаны войскамі Карла XII (узарваныя ўсе чатыры куты замка, разбураны дзве яго вежы, парэшткі якіх у выглядзе земляных пагоркаў былі даследаваны археолагамі толькі ў 1977 г.). Такі ж лёс напаткаў сямівежавы Наваградскі замак і замак, збудаваны пры Радзівілу Сіротку ў канцы XVI ст. у Нясвіжы.

Войны пакідалі сляды і ў тапаграфіі гарадоў. Прыкладам можа быць "вал Івана Грознага" ў Полацку – парэшткі замка, узведзенага стральцамі падчас Лівонскай вайны другой паловы XVI ст. Пры гэтым было часткова зменена русла Палаты і зменьшылася плошча старажытнага Рагвалодава гарадзішча. Памяць аб вайне 1812 г. – назва маста праз тую ж Палату: "Красны мост", які быў месцам крывавага супрацьстаяння паміж расійскім і французскім войскамі.

Войны – гэта і жахлівыя людскія страты. Прыкладам, у час вайны 1558-83 гг., калі Полацк на некалькі гадоў быў захоплены стралецкім войскам, у горадзе былі вынішчаны практычна ўсе яўрэі.

Памежны з Маскоўскім царствам г. Мсціслаў у вайну 1654-67 гг. быў спалены, а насельніцтва вынішчана, што засведчылі археалагічныя раскопкі. Прыкладам, толькі у адным раскопе плошчаю ў 16 кв.м. каля былой царквы ў суцэльным слоі пажару знойдзены парэшткі сямі чалавек, прычым толькі адзін быў пахаваны ў труне, а астатнія ляжалі уздоўж і папярок раскопа (былі проста прысыпаныя зямлёй там, дзе іх застала смерць).

Войны ці іх пагрозы прымушалі ўвесь час дбаць пра ўдасканаленне зброі і пра абарончыя якасці замкаў. Так, са з'яўленнем металічнага рыцырскага панцыра на змену звычайнаму луку прыйшоў механічны – арбалет, на змену драўляным замкам – каменныя і цагляныя, дахі якіх сталі пакрывацца керамічнай дахоўкай. Гэта дало штуршок развіццю кавальства, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. Такім чынам, вайна аб'ектыўна стымулявала развіцце матэрыяльнай культуры ў цэлым, а не толькі ваеннай справы.

Сляды войнаў праз стагоддзі захаваў культурны пласт даследаваных паселішчаў ад часоў першабытнасці да XX ст. Ён насычаны не толькі рэшткамі прадметаў побыту, але і мілітарнымі артэфактамі. Матэрыяльная культура ўсіх народаў свету нязменна складаецца з гэтых дзвюх частак: побытавых рэчаў і зброі. Парэшткі таго і другога складаюць большасць артэфактаў культурнага слоя.

Патрэба ў абароне, таксама як ў ежы, адзенні, прадаўжэнні рода – адзін з базавых інстынктаў чалавека. Пры выбары месцаў для

паселішчаў з пераходам да аселага ладу жыцця, ў жалезным веку, людзі выбіралі месцы, абароненыя самой прыродай: на ўзгорках, мысах, у месцы зліцця рэк. На Палессі ўзніклі спецыфічныя тыпы паселішчаў – балотныя гарадзішчы, у тым ліку так званыя "городища-убежища", якія былі прытулкам насельніцтву толькі падчас ваенных пагроз. Прыкмета такіх паселішчаў – адсутнасць у культурным пласце селькагаспадарчага інвентара і наяўнасць прадметаў узбраення. Прыкладам паселішча-крэпасці можа быць гарадзішча "Замэчак" у Заслаўі, на якім у выніку раскопак знойдзены не толькі сляды ўмацаванняў, але і прысутнасці ўзброеных воінаў-дружыннікаў [1, с. 70-77].

У перыяд сярэднявечча месцамі найбольшага скаплення мілітарных артэфактаў найперш былі паселішчы, размешчаныя ўздоўж рэк. Гэта нашы гарады XI–XII ст. ўздоўж Прыпяці, Дзвіны, Дняпра, што звязана з роллю ракі як абаронцы, перашкоды на шляху захопнікаў. Пацвержданнем гэтаму – вядомыя бітвы, названыя па рэках (бітвы на Нямізе, Крапіўне, Сініх водах, Ворскле).

Другая роля рэк – гэта мяжа. Рака Нёман была сапраўдным шчытом супраць крыжакоў ў XIV – пачатку XV ст. Падчас раскопак Гродзенскага замка, пабудаванага ў XII ст. на высокім беразе Нёмана, знойдзены разнастайныя фрагменты зброі XII–XVI стст. (наканечнікі стрэл і дзідаў, арбалетныя балты), шпор і рыцарскага панцыра [2, с. 59; мал. 57]. Пра напады і спробу узяць замак сведчаць знойдзеныя там каменныя ядры – цэлыя і пашкожданыя [2, мал. 110].

Замкі былі сапраўдным аплотам абароны у XIV – XVI стст. У культурным пласце практычна кожнага з іх знойдзены арбалетныя стрэлы [3, с. 278-280, мал.172:14]. Самая сенсацыйная знаходка – галава каня з арбалетнай стралой ў чэрапе, знойдзеная ў Лідскім замку. А ў балоце ля сцен замка пры геадэзічных працах быў знойдзены кароткі меч-корд часоў барацьбы з крыжакамі [4, с. 81].

Балоты – цудоўнае асяроддзе для захавання артэфактаў, у чым перканаліся археолагі. Гэта датычыцца не толькі балотаў поймы Бярэзіны ля в. Студзёнкі, дзе перыядычна знаходзяць прадметы часоў вайны 1812 г., у тым ліку і ўзбраенне, але і часоў неаліта. Пра гэта сведчаць знаходкі з косці і дрэва з тарфянікавай стаянкі позняга неаліта-ранняга бронзавага веку Асавец Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Там побач з крамянёвымі стрэламі і коп'ямі знойдзены і вырабы з косці добрай захаванасці [5; 6, мал. 116, 119].

Знаходкі зброі ў сярэднявечным культурным пласце – даволі рэдкая з'ява. Яны фрагментарныя, паколькі ўсё прыдатнае для абароны ці

рамонту-пераробкі старанна збіралася пераможцамі. Таму рэканструкцыя арганізацыі вайсковай справы і матэрыялы для вывучэння зброі ў ВКЛ робіцца на падставе археалагічных і пісьмовых крыніц [7]. На падставе археалагічных знаходак мы ведаем пра супрацьстаянне Прыпяцкіх гарадоў татарскай навале ў XIII ст. (па знаходках наканечнікаў татарскіх стрэл у культурным пласце); пра набегі крыжакоў на нашыя заходнія крэпасці і замкі ў XIV – пачатку XV ст. (Гродна, Крэва, Ліду, Брэст і інш.) – па каменных ядрах і арбалетных стрэлах. Але мы вучыліся біць ворага яго ж зброяй, запазычваўшы ў іх ўсё самае передавое ў ваеннай справе. Так, крыжацкія замкі-кастэлі паслужылі ўзорам для ўзвядзення нашых кастэляў у Лідзе і Крэва. На змену цэгле-плінфе таўшчыней 3–3,5 см прышла з тэрыторыі Германіі вялікапамерная цэгла таўшчыней да 7–9 см, што амаль утрая паскарала ўзвядзенне сцен [8, с. 111-117]. Павялічвала абароназдольнасць замкаў і керамічная дахоўка як проціпажарны сродак [9].

З узнікненнем агнястрэльнай зброі ў культурным пласце знаходзяць кулі ад ручной зброі. Гэта – знаходкі з пластоў XVII ст., і найбольш іх – у матэрыялах з раскопак нашых усходніх памежных гарадоў (Мсціслава, Крычава, Магілева) слоя часоў вайны 1654-67 гг. з усходнімі суседзямі. Знаходкі кулялеек сведчаць пра наладжаны выраб куль мясцовымі збройнікамі.

Гэта вайна зрабіла беларусаў міжвольнымі культуртрэгерамі – рэтранслятарамі еўрапейскай культуры на тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы. Маецца на ўвазе не толькі асветніцкая дзейнасць нашага Сімяона Полацкага пры двары Аляксея Міхайлавіча. Праз нашых збройнікаў, залатых спраў майстроў, кафляроў і шкларобаў, што трапілі ў Маскву з вялікім палонам і былі расселеныя ў сталіцы ў Мяшчанскай слабадзе, мясцовыя рамеснікі засвоілі тэхналогію вытворчасці паліхромнай кафлі і іншыя заходнеўрапейскія рамесныя тэхналогіі [10].

Двадцатае стагоддзе выявіла сваю разбуральную сутнасць праз дзве сусветныя вайны. Яны закранулі не толькі сучаснікаў, але ўварваліся нават ў прапласткі XIV ст. Мы можам сказаць, перш за ўсё, пра след, які гэтыя войны пакінулі ў гісторыі. Як ні дзіўна, найбольш гэта прасочваецца ў лёсе замкаў XIV ст. Крэва ў Першую сусветную вайну амаль два гады было на лініі фронту. Вынікам стала будаўніцтва бетоннага бункера на месцы адной з вежаў. У верхнім слоі культурнага пласта замка траплялiся сляды прысутнасці вайскоўцаў на яго тэрыторыі.

Лідскі замак захаваў сляды Другой сусветнай вайны. Падчас археалагічных раскопак у 1978 і 1980 гг. на замкавым двары ў верхнім слоі раскопаў трапляўся порах з артылерыйскіх снарадаў, цэлыя снарады і авіябомбы. Па сведчанні мясцовых жыхароў, замкавая тэрыторыя выкарыстоўвалася пад склад баепрыпасаў. Пра маштабы боезапасу даў уяўленне адзін выпадак. На тэрыторыі замка падчас яго функцыянавання існавалі два калодзежы, якія на час раскопак уяўлялі сабою "мацерыковыя ямы". Адзін з калодзежаў быў закінуты яшчэ ў XVII ст.: яма паступова ператварылася ў яму-сметніцу са знаходкамі XVII ст. Другі калодзеж быў запоўнены снарадамі часоў вайны. Так што выкліканым сапёрам давялося працаваць археолагамі.

Вайна ўрывалася ў археалагічныя даследаванні часам зусім нечакана. Так, пры даследаванні "Эканамічнага дома" Багаяўленскага манастыра XVIII ст. ў Полацку, разбуранага пасля вайны, падчас расчысткі падвальнага памяшкання з-пад падмурка адной са сцен высыпалася шмат патронаў. Было падобна, што яны былі ў нешта загорнуты і схаваны пад сцяною. Хутчэй за ўсё, гэта была схованка некага з полацкіх падпольшчыкаў. Улічваючы, што патроны не выкарысталі, лёс яго не пашкадаваў.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. *Заяц Ю.А.* Гарадзішча Замэчак у Заслаўі // Весці АН БССР. Сер. Грамад. Навук. 1983. № 3. С. 70–77.
2. *Трусаў А.А., Собаль В.Е., Здановіч Н.І.* Стары замак у Гродне XI–XVIII стст.: гісторыка-археалагічны нарыс. Мінск: Навука і тэхніка, 1993.
3. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В.М. Ляўко [і інш.]; пад рэд. В.М. Ляўко [і інш.]. Мінск: Беларуская навука, 2001.
4. *Трусаў А.А., Краўцэвіч А.К., Сагановіч Г.М.* Металічныя вырабы Лідскага і Мірскага замкаў // Весці АН БССР. Сер. Грамад. Навук.1987. № 4. С. 81-82.
5. *Чарняўскі М.М.* Неаліт Беларускага Панямоння. Мінск: Навука і тэхніка, 1979.
6. Археалогія Беларусі. Т. 1.Каменны і бронзавы вякі / Э.М. Зайкоўскі [і інш.]; пад рэд. М.М. Чарняўскага [і інш.]. Мн.: Беларуская навука, 1997.
7. *Бохан Ю.Н.* Узбраенне насельніцтва беларускіх зямель у XIV–XVI ст. – Мн.: Беларусь, 2012.
8. *Трусов О.А.* Большемерный кирпич XIII-XVII вв. на территории Белоруссии // Краткие сообщения Института археологии. 1991, № 205. С. 111-117.
9. *Трусаў А.А.* Беларуская чарапіца. // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1983, № 1. С. 30-32.
10. *Абецедарский Л.С.* Белорусы в Москве XVII в. Мн.: БГУ, 1957.